**ДРУГІ (ВОЧНЫ) ЭТАП МІНСКАЙ ГАРАДСКОЙ АДКРЫТАЙ**

**ІНТЭРНЭТ-АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ**

**І тур 2010 - 2011 навучальны год**

**Комплексная работа**

**9 клас**

**Заданне 1. Запішыце, якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | |
|---|---|
| 1. Раманкевіч **якую хвіліну** паўзіраўся туды, куды меўся ісці. (У. Ягоўдзік) | |
| 2. Не, **жыць**, брат, трэба і жыць – многа!.. (Якуб Колас) | |
| 3. З гэтага «**я табе аддзякую**» заўсёды смяяліся ўсе яго таварышы. (К.Чорны) | |
| 4. Вяль Музыку так гаворыць: – Мы гасцей **з-за сіня мора** без цябе тут прывітаем. (М.Танк) | |
| 5. Не кажы мне "**бывай**", "**да спаткання**" скажы. (А.Бялевіч) | |

**Заданне 2. Прааналізуйце прыведзеныя сказы па мэце выказвання і адзначце сярод іх пятае «лішняе». Выбар абгрунтуйце.**

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

1. Людзі, ды паглядзіце вы на чалавека! (Л. Галубовіч)
2. Няхай былое душу бяссоніць, Хай ачышчае і лечыць нас. (С. Давідовіч)
3. Гэй, пара запаліць каганец! (У. Жылка)
4. Хай бы дзеці пагулялі. (А. Жук)
5. – Гаварыце так, як думаеце... (Г. Далідовіч)

**Заданне 3. Закончыце выказванні. Запішыце 1) нумары складаназлучаных сказаў; 2) нумары складаназалежных сказаў.**

*Максімальная колькасць балаў – 7*

1. Сярмяга – не знявага, а жупан – ____________________________.
2. Каб __________________________________, трэба ёй пакланіцца.
3. Усе бабры дабры, адно выдра – ____________________________.
4. ____________________________ – не здарова.
5. Ці міла, ці няміла, але грошы плаціла – _______________________.

**Складаназлучаныя сказы _________**

**Складаназалежныя сказы _________**

**Заданне 4. Адзначце сказ, які не адпавядае агульнаму характару адносін паміж часткамі складаназлучанага сказа. Адказ абгрунтуйце.**

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

1. Пракрычаў удод і змоўк, толькі вые недзе воўк. (С. Грахоўскі.
2. Над жытамі песні льюцца, Толькі сонца ўстане.. (Я. Колас)
3. У хаце пакуль што ціха, адно чуецца бясконцая малітва старога Максіма... (Л. Дранько-Майсюк)
4. Гадзюка не рухалася, як здранцвела, толькі доўгі хвост ледзь заўважна ўздрыгваў, выдаваў нервознасць злой істоты. (А. Бароўскі)

5. Было быццам ціха, адно мерна гуў пад столлю вялізны трохлопасны вентылятар. (В. Быкаў)

**Заданне 5. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку і растлумачце Ваш выбар.**

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

1. Узмах вясла і човен нячутна і доўга слізгае па вадзе, спрэс пакрытай шыгаллем і струхлелай карой. (А. Бароўскі)
2. Дзесьці песня лунае і не музыкай лесавою поўняцца вокны светлых хат над ракою. (М. Лынькоў)
3. Шапка зляцела ў таго з галавы і сам ён захістаўся і паляцеў потырч носам на гэты пень. (Якуб Колас)
4. На свеце ўсякага жыцця даволі і чалавечае долі шмат... (К.Чорны)
5. Перад вечарам пабыў спорны дождж і цяпер пад нагамі адчувалася сырасць. (І.Чыгрынаў)

**Заданне 6. Аднавіце зашыфраваныя ў выказваннях сімвалічныя асобы, прадметы, паняцці і з’явы з традыцыйнай культурнай спадчыны беларусаў. Укажыце, які тып сказа пры гэтым выкарыстоўваецца.**

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

1. *Дух, які змушае чалавека валацужнічаць, гоніць з наседжанага месца.*
   Гэта ___________________.
2. *Апошнія каласы, пакінутыя на полі для таго, каб забяспечыць ураджай наступнага года.*
   Гэта ___________________.
3. *Дэталь ткацкага варштата, з дапамогай якой раздзялялі ніткі асновы.*
   Гэта ___________________.
4. *Печыва, якое звязваецца з ідэяй ахвяравання продкам.*
   Гэта __________________.

   ТЫПЫ СКАЗАЎ:______________________________

**Заданне 7. Запоўніце табліцу, указаўшы ролю слова *калі* і тып сказаў, у якіх яно ўжываецца.**

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Сказ | Тып сказа | Роля слова *калі* |
|---|---|---|
| **1.** *У той дзень,* ***калі*** *яны сустрэліся, зацвіла чаромха.* | | Злучальнае слова |
| **2.** | Складаназалежны з даданай дапаўняльнай. | |
| **3.** *Яму было вядома,* ***калі*** *прывязуць новыя падручнікі* | | |
| **4.** | Складаназалежны з даданай акалічнаснай умовы. | Злучнік |

**Заданне 8. Складзіце і запішыце сказы, якія адпавядаюць прыведзеным схемам. Укажыце тыпы гэтых сказаў.**

*Максімальная колькасць балаў – **10**.*

СХЕМА 1. *[Пачулася], (быццам…).*

СХЕМА 2. *[…], (дарма што…).*

СХЕМА 3. *[…], (дык…).*

СХЕМА 4. *[..такая], (што…).*

СХЕМА 5. *[…. прыслухоўваецца], (ці…).*

**Заданне 9. Запішыце, якімі знакамі (спосабамі) абазначаецца мяжа паміж: а) часткамі сказа; б) сказамі; в) часткамі тэксту.**

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

а) ____________________________________________
б) ____________________________________________
в) ____________________________________________

**Заданне 10. Запоўніце пустыя клеткі ў табліцы:**

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

| *Род літаратуры* | *Аўтар* | *Твор* | *Жанр* | *Ідэя і яе ўвасабленне* |
|---|---|---|---|---|
| Лірыка | | “Слуцкія ткачыхі” | Грамадзянская лірыка | Любоў да Радзімы і волі праз вобраз васілька |
| Эпас | Генрых Далідовіч | “Губаты” | | Дабрыня і міласэрнасць да прыроды, шматфарбнасць навакольнага свету, лірычнасць аповеду |
| Драма | Янка Купала | | Камедыя з элементамі драмы | Канфлікт новага і старога пакаленняў, высмейванне пыхлівасці і духоўнай абмежаванасці, індывідуалізацыя мовы персанажаў |

**Заданне 11. Знайдзіце лішні элемент у пераліку і растлумачце свой выбар:**

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

Экспазіцыя, развязка, лірызм, завязка, эпізод, кульмінацыя.

**Заданне 12. Устаўце прапушчаныя словы:**

*Максімальная колькасць балаў – **3.***

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не _____________-,
Каб не страціць святое штосьці.

Не забыць, як падвялы аер
На памытай падлозе пахне,
Як у студню ________ асвер
Запускае руку да пахі.

Не забыць сцежкі той, што цябе
На дарогу выводзіла з дому,
Што у хаце там быў рубель
У цане і па курсу старому.

Не забыць, як марозам злым
________ пальцы пячэ балюча
І адкуль на стале тваім
Бохан свежага хлеба пахучы.

**Заданне 13. Запішы назву вышэй цытаванага твора і яго аўтара.**

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

**Заданне 14. Вызначце назву твора, пра які ідзе гаворка, яго аўтара і жанр:**

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

Выдатны твор беларускай літаратуры эпохі Адраджэння на лацінскай мове. Увасабленне рэнесансавых ідэй у вобразе Вітаўта. Сімвалічнае значэнне цэнтральнага вобраза і сцэн вялікакняскага палявання. Гуманізм, агульначалавечыя каштоўнасці ў аснове твора.

---

**ДРУГІ (ВОЧНЫ) ЭТАП МІНСКАЙ ГАРАДСКОЙ АДКРЫТАЙ**

**ІНТЭРНЭТ-АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ**

**І тур 2010 - 2011 навучальны год**

**Комплексная работа**

**9 клас**

## ДАВЕДКІ

| **Заданні** | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *11* | *12* | *13* | *14* | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **5** | **3** | **7** | **3** | **5** | **5** | **6** | **10** | **3** | **3** | **3** | **3** | **2** | **3** | **61** |

**Заданне 1.**

| | |
|---|---|
| 1. Раманкевіч **якую хвіліну** паўзіраўся туды, куды меўся ісці (У. Ягоўдзік) | ***акалічнасцю*** |
| 2. Не, **жыць**, брат, трэба і жыць – многа!.. (Якуб Колас) | ***дзейнікам*** |
| 3. З гэтага «**я табе аддзякую**» заўсёды смяяліся ўсе яго таварышы (К.Чорны) | ***дапаўненнем*** |
| 4. Вяль Музыку так гаворыць: – Мы гасцей **з-за сіня мора** без цябе тут прывітаем (М.Танк). | ***азначэннем*** |
| 5. Не кажы мне “**бывай**”, “**да спаткання**” скажы (А.Бялевіч). | ***дапаўненнем*** |

**Заданне 2.**

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ***4 сказ.***

КАМЕНТАРЫЙ:

Даволі выразна ва ўсіх сказах праяўляецца пабуджальнасць – выражэнне волевыяўлення таго, хто гаворыць. Аднак 4 сказ адрозніваецца больш «мяккім» характарам выражэння гэтага значэння, бо ўтрымлівае ў сабе значэнне пажадання, а не пабуджэння. У навуковай літаратуры такія сказы называюць *аптатыўнымі*.

**Заданне 3.**

1. Сярмяга – не знявага, а жупан – ***не вялікі пан***.
2. Каб ***вады напіцца***, трэба ёй пакланіцца.
3. Усе бабры дабры, адно выдра – ***ліха яе бяры***.
4. ***Што задужа*** – не здарова.

<u>Складаназлучаныя: 1, 3.</u>
<u>Складаназалежныя: 2, 4.</u>

**Заданне 4.**

<u>ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ</u>: ***2 сказ***.

<u>КАМЕНТАРЫЙ</u>:

***Сказы 1, 3, 4, 5*** – складаназлучаныя з супастаўляльнымі адносінамі паміж часткамі.
***Сказ 2*** – складаназалежны з даданай акалічнаснай.

**Заданне 5.**

КАМЕНТАРЫЙ:

1. Узмах вясла – і човен нячутна і доўга слізгае па вадзе, спрэс пакрытай шыгаллем і струхлелай карой (А. Бароўскі).
***[Пры хуткай змене падзей паміж часткамі складаназлучанага сказа ставіцца працяжнік.]***
2. ***Дзесьці*** песня лунае, і не музыкай лесавою поўняцца вокны светлых хат ***над ракою*** (М. Лынькоў).
***[Перад злучнікам і паміж часткамі складаназлучанага сказа ставіцца коска. Акалічнасць дзесьці адносіцца толькі да першай часткі.]***
3. Шапка зляцела ў таго з галавы, і сам ён захістаўся і паляцеў потырч носам на гэты пень (Якуб Колас).
***[Перад злучнікам і паміж часткамі складаназлучанага сказа ставіцца коска.]***
4. ***На свеце*** ўсякага жыцця даволі і чалавечае долі шмат... (К.Чорны)
***[Перад злучнікам і паміж часткамі складаназлучанага сказа коска не ставіцца, бо ў першай ёсць агульны член на свеце, які адносіцца да першай і другой частак.]***
5. ***Перад вечарам*** пабыў спорны дождж, і ***цяпер*** пад нагамі адчувалася сырасць (І.Чыгрынаў).
***[Перад злучнікам і паміж часткамі складаназлучанага сказа ставіцца коска. Акалічнасць перад вечарам адносіцца толькі да першай часткі.]***

**Заданне 6.**

1. *Дух, які змушае чалавека валацужнічаць, гоніць з наседжанага месца* ***(Бадзюля).***
2. *Апошнія каласы, пакінутыя на полі для таго, каб забяспечыць ураджай наступнага года* ***(барада).***
3. *Дэталь ткацкага варштата, з дапамогай якой раздзялялі ніткі асновы* ***(бёрда)****.*
4. *Печыва, якое звязваецца з ідэяй ахвяравання продкам* ***(бліны)****.*
ТЫП СКАЗАЎ: Складаназалежныя

**Заданне 7.**

| Сказ | Тып сказа | Роля слова *калі* |
|---|---|---|
| **1.** *У той дзень,* ***калі*** *яны сустрэліся,зацвіла чаромха.* | **Складаназалежны з даданай азначальнай.** | Злучальнае слова |
| **2. Я не ведаю, калі скончыцца гэты дождж.** | Складаназалежны з даданай дапаўняльнай. | **Злучальнае слова** |
| **3.** *Яму было вядома,* ***калі*** *прывязуць новыя падручнікі* | **Складаназалежны з даданай дзейнікавай.** | **Злучальнае слова** |
| **4. Калі падрыхтуешся, здасі экзамен на выдатна.** | Складаназалежны з даданай акалічнаснай умовы. | Злучнік |

**Заданне 8.**

СХЕМА 1. *[Пачулася], (быццам…).*
СКАЗ: . *[Пачулася],* ***быццам*** *нехта заспяваў.*
ТЫП: Складаназалежны з даданай дзейнікавай.

СХЕМА 2. *[…], (дарма што…).*
СКАЗ: *[Хлопчык разумны],* ***дарма*** *што малы.*
ТЫП: Складаназалежны з даданай уступальнай.

СХЕМА 3. *[…], (дык…).*
СКАЗ: *[Прайшоў добры дождж],* ***дык*** *за ноч грыбоў нарасце.*

ТЫП: Складаназалежны з даданай выніковай.

<u>СХЕМА 4</u>. *[..такая], (што…).*
СКАЗ: *[Радасць **такая**], **што** сэрца выскоквае.*
ТЫП: Складаназалежны з даданай выказнікавай.

<u>СХЕМА 5</u>. *[…. прыслухоўваецца], (ці…).*
СКАЗ: *[Бабуля **прыслухоўваецца**], **ці** не пастукае ў дзверы хто.*
ТЫП: Складаназалежны з даданай дапаўняльнай.

**Заданне 9.**

а) ***(,), (:), (–), (;)***
б) ***(.), (!), (?), (…)***
в) ***чырвоны радок***

**Заданне 10.**

**Правільныя адказы:**
Максім Багдановіч,
апавяданне,
“Паўлінка”.

**Заданне 11.**

**Каментарый: за вызначэнне слова 1 бал, за тлумачэнне 2 балы.**
**Правільны адказ**: Лірызм.
Характарыстыка настраёвасці, спосабу пабудовы дыялога паміж аўтарам і чытачом; усе іншыя тэрміны абазначаюць элементы сюжэтна-кампазіцыйнай будовы твора.

**Заданне 12.**

**Правільныя адказы:**
ачарсцвець,
цыбаты,
клямка.

**Заданне 13.**

**Правільныя адказы:**
“Трэба дома бываць часцей”,
Рыгор Барадулін.

**Заданне 14.**

**Правільныя адказы:**
“Песня пра зубра",
Мікола Гусоўскі,
паэма